# Мая праграма

**Паважаныя сябры**!

Дэпутат – гэта найперш палітык, задача якога ствараць законы і правілы, па якіх мы жывем. Гэта той чалавек, якога Вы “наймаеце” дзеля таго, каб у краіне дзейнічалі законы, якія ахоўвалі б інтарэсы кожнага грамадзяніна і былі роўныя для ўсіх.

Дэпутат таксама павінен быць у цэнтры грамадскага жыцця сваёй акругі, мець сетку грамадскіх прыёмных у зручных для грамадзян месцах, гарачую тэлефонную лінію, аказваць бясплатныя кансультацыі па неадкладных пытаннях.

**Наша Беларусь – гэта краіна з вялікімі магчымасцямі і багатай еўрапейскай гісторыяй**. Я веру ў тое, што ў нашых сілах **зрабіць Беларусь моцнай і квітнеючай**. Зрабіць гэта могуць толькі адказныя, рашучыя, прафесійна падрыхтаваныя палітыкі, а не маўклівыя статысты.

**Мы**, **Беларусы**, – **працавіты**, **сумленны і таленавіты народ**. Але нашай стваральнай працы перашкаджаюць адміністрацыйныя бар’еры: беларускае падатковае заканадаўства – гэта невыносны цяжар на плячах любога прадпрыемства; доўгая і дарагая працэдура рэгістрацыі і ліцэнзіявання перашкаджае развіццю сваёй Справы для кожнага. Я выступаю за тое, каб мы плацілі адзін-два фіксаваныя падаткі, як у цывілізаваных краінах, і самі вырашалі, на што выдаткоўваць заробленыя грошы!

**Я прашу Вашай падтрымкі**, каб, прафесійна і сумленна працуючы ў парламенце, змяніць сітуацыю ў краіне на карысць кожнага з Вас і ўсіх грамадзян Беларусі.

Вось галоўныя прыярытэты маёй дзейнасці ў парламенце:

- **утульнасць нашага жыцця і сямейны дабрабыт**;
- **еўрапейская адукацыя і будучыня для нашых дзяцей**;
- **высокі прэстыж нашай краіны ў Еўропе і свеце**.

*Захад сталіцы – бліжэй да Еўропы!*

1. **Утульнасць нашага жыцця** – гэта чыстыя і добраўпарадкаваныя дамы і двары, хуткі і даступны транспарт, паліклінікі, цэнтры сацыяльнай дапамогі, фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры, басейны, крамы, банкі, кампутарныя цэнтры.

Каб дасягнуць гэтага, лічу неабходным:
– наладзіць працу **Камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання**. Як дэпутат, я буду ініцыяваць іх стварэнне. Разам з дэпутатамі гэтыя камітэты будуць кантраляваць мясцовыя ўлады адносна ўсіх жыццёва важных праблем нашых мікрараёнаў: Сухарава, Захад, Чырвоны Бор, Кунцаўшчына.
– зменшыць падаткі для прыватных перавозчыкаў, што прывядзе да зніжэння цэнаў на маршрутныя таксі;
– пабудаваць шматузроўневыя паркінгі і гаражы з тым, каб зменшыць колькасць аўтамабіляў, прыпаркаваных у нашых дварах.

Як дэпутат я буду першачаргова дамагацца, каб

- адмяніць занадта дарагі маршрут аўтобуса №523, а **аўтобус №26 павінен з большай рэгулярнасцю руху злучаць наша Сухарава з рынкам** “**Ждановічы**” па звычайным тарыфе;
- **падоўжыць маршрут аўтобуса №**77 ад яго цяперашняга канцавога прыпынку “Вуліца Адзінцова” па вуліцах Садовая і Вышэлескага **да цэнтру былой вёскі Кунцаўшчына** з канцавым пунктам на перакрыжаванні вуліц Вышэлескага і Брыкета.
- Падоўжыць **тралейбусныя маршруты №**9, 13, 44 **да д/с Сухарава** (**Лабанка-Сухараўская**) з далейшым працягам да д/с Сухарава-6.

**Пабудаваць сямейны дабрабыт** з любімай працай і годным заробкам для кожнага можна толькі на базе рынкавай эканомікі з яснымі і роўнымі для ўсіх законамі.

Я выступаю за ўнясенне зменаў ў заканадаўства пра замежныя інвестыцыі, за зніжэнне падатковых ставак для інвестараў, за спрыянне ўвозу найноўшых тэхналогіяў. Бо перадавая вытворчасць – гэта добрыя заробкі ды годнае жыццё для нас і нашых дзяцей, гэта ўпэўненая будучыня для ўсёй краіны.

Каб спрыяць сям’і, дзяржава павінна падвысіць памеры гарантаванай дапамогі шматдзетным сем’ям, няпоўным сем’ям, сем’ям з дзецьмі-інвалідамі, незалежна ад памераў даходаў бацькоў.

*Захад сталіцы – бліжэй да Еўропы!*

2. **Еўрапейская адукацыя для нашых дзяцей**.
Адукацыя і будучыня нашых дзяцей узаемазалежныя. Упэўнены, што не ў інтарэсах беларускага грамадства неабгрунтаванае закрыццё лепшых і самых адкрытых да кантактаў навучальных установаў, Беларускага гуманітарнага ліцэю імя Я.Коласа і Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта.

Сучасная якасная адукацыя азначае веданне інфармацыйных тэхналогіяў, замежных моваў і развіццё здольнасцяў да наватарства. Гэта забяспечваецца ў тым ліку і праз кантакты і абмены з прадстаўнікамі розных культур і традыцыяў.

Пачынаць трэба са школы! Я хачу і магу дапамагчы кожнай школе, кожнай гімназіі акругі знайсці замежнага партнёра – школу, гімназію ці ліцэй Польшчы, Францыі, Германіі, Вялікабрытаніі. Нашыя дзеці і іх настаўнікі атрымаюць шанс раўняцца на лепшыя ўзоры!

Як дэпутат я буду першачаргова дамагацца, каб

- наша дзяржава забяспечвала сапраўды якаснае харчаванне ў садках і школах;
- малады спецыяліст па сканчэнні ВНУ меў права выбару: карыстацца падтрымкай дзяржавы або самому шукаць сабе працу.

3. **Высокі прэстыж краіны ў Еўропе і свеце**.

Мы павінны адкрыць нашу краіну як на ўсход, так і на захад. А таму адной з галоўных задачаў новага парламента павінна стаць наладжванне добрых сяброўскіх стасункаў з нашымі заходнімі суседзямі.

Мой вопыт вучобы і працы ў розных краінах дае мне падставы сцвярджаць: нашыя заходнія суседзі хочуць сябраваць і быць нашымі добрымі партнёрамі.

Перакананы, што ў **беларускім нацыянальным інтарэсе збліжацца з аб’яднанай Еўропай**, дасягнуць еўрапейскіх стандартаў узроўню жыцця, дэмакратыі, павагі да правоў чалавека. Як дэпутат я буду ініцыяваць стварэнне Цэнтраў еўрапейскай інфармацыі для жыхароў акругі.

**Наша Беларусь годная таго, каб быць заможнай, вольнай і паважанай**!

*Захад сталіцы – бліжэй да Еўропы!*

КАЖУЦЬ ПАВАЖАНЫЯ ЛЮДЗІ:



**Уладзімір Ліпскі**
*Старшыня праўлення Беларускага дзіцячага фонду, член Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі.*

Аляксандр Лагвінец паходзіць з Гомельшчыны. Паважаю і цаню яго, бо ён сам, без “валасатай рукі”, потам свайго таленту прабіваецца ў людзі, у высокі свет дабрыні і справядлівасці. Мой зямляк – руплівец нашай Бацькаўшчыны, шчыры, сумленны, з еўрапейскай адукацыяй чалавек. Такія людзі, сцвярджае Прэзідэнт, павінны прыйсці да ўлады. Божа, хай так будзе!



**Галина Тумилович**
*Кандидат исторических наук, Декан Франко-белорусского факультета политических наук Европейского гуманитарного университета (ЕГУ).*

Александр Иванович Логвинец – настоящий политолог-профессионал. Работая в ЕГУ, он смог ярко проявить все свои знания и способности, чем снискал необычайную популярность среди студентов и заслужил однозначно уважительное отношение со стороны коллег и всех сотрудников факультета. А.И. Логвинца отличают также неиссякаемая энергия, искрометная реакция и в то же время очень чуткое и внимательное отношение ко всем тем, кто его окружает.
Вот он, - представитель молодой белорусской элиты, которая по праву будет определять будущее нашей страны.



**Лявон Вольскі**
*Лідар гуртоў “**N.R.M.**” і “Крамбамбуля”, аўтар і выканаўца песень “Госьці”, “Тры чарапахі” і інш.*

Лічу, што прысьпеў час, калі ва ўладу мусяць прыйсьці людзі не з апарату, не абрыдлыя ўсім чырвонатварыя намэнклятуршчыкі, а таленавітыя, адукаваныя і амбітныя маладыя кіраўнікі.
Аляксандар Лагвінец – добры прыклад такога чалавека. Яму можна давяраць. Бо ён сапраўды любіць наш Край і здольны зьмяніць яго ў лепшы бок.

*Захад сталіцы – бліжэй да Еўропы!*

## Логвинец Александр Иванович

Родился 14 января 1972 года в д. Дворище Хойникского района в крестьянской семье. Белорус. Беспартийный.

В 1995 г. с отличием окончил БГУ по специальности “Международные отношения”.
В 1996 г. стажировался в Оксфордском университете (Великобритания).

В 1997-98 гг. изучал политологию в Институте политических наук (Страсбург, Франция). Получил степень магистра политологии.

В 1999 г. вернулся на Родину и стал работать преподавателем политологии франко-белорусского факультета политических наук ЕГУ (Европейский гуманитарный университет), **профессионально владеет тематикой государственного управления и внешней политики**.

Свободно владеет русским, французским, английским и польским языками. Родной язык – белорусский.

Автор работ о роли и месте Беларуси в Европе, о перспективах стратегического развития нашей страны. Неоднократно выступал в белорусской и зарубежной печати, на телевидении.

Женат, жена – учительница начальных классов. Сыну 9 лет. Проживают в микрорайоне Сухарево.

Хобби: футбол, прогулки на велосипеде.

**Я доверяю Вашему выбору!**

Аляксандр Лагвінец
(029) 606-10-34; (029) 509-90-93
a_lahviniec@tut.by

*Захад сталіцы – бліжэй да Еўропы!*

## ЗА БЕЛАРУСЬ!
## ЧАС ПРАФЕСІЯНАЛАЎ!



**ЛАГВІНЕЦ**

**АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ** ü

**ЗА**:

**УТУЛЬНАСЦЬ НАШАГА ЖЫЦЦЯ І СЯМЕЙНЫ ДАБРАБЫТ**

**ЕЎРАПЕЙСКУЮ АДУКАЦЫЮ ДЛЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ**

**ВЫСОКІ ПРЭСТЫЖ НАШАЙ КРАІНЫ Ў СВЕЦЕ**

*Захад сталіцы – бліжэй да Еўропы!*